ПАСТАНОВА
Савета аддзела ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама
30.05.2019 № 9
г. Пінск

Сёлета спаўняецца 75 год вызвалення Беларусі ад нямецка фашысцкіх захопнікаў. Для ўзмацнення ролі публічных бібліятэк да захавання памяці аб героях-земляках Вялікай Айчыннай вайны, патрыятычнага выхавання моладзі і падрастаючага пакалення сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” прайшоў раённы агляд-конкурс на лепшую тэатралізаваную імпрэзу «Ішоў наш край дарогамі вайны».

У раённам аглядзе-конкурсе прынялі ўдзел 31 бібліятэка.

Разглядзеўшы крытэрыі адзнак і заслухаўшы інфармацыю дырэктара дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” Анташук А.І., Савет аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прызнаць пераможцамі раённага агляду-конкурсу:

- аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц (загадчык аддзелам Самуйлік І. І.) - І месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” *за літаратурна-музычную імпрэзу “Мы помним! Мы гордимся!”*
- Лагішынскую гарпасялковую бібліятэку (загадчык бібліятэкі Гусіна Л.І.) – ІІ месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” *за тэатралізаванае мерапрыемства “В памяти людской мгновения войны”.*
- Парахонскую сельскую бібліятэку (загадчык бібліятэкі Лосіч С.П.) - ІІІ месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” *за тэатралізаванае мерапрыемства “Мы помним! Мы чтим!”.*

2. Узнагародзіць Граматамі і грашовымі прэміямі (1 месца - 3 базавыя велічыні, 2 месца – 2 базавыя велічыні, 3 месца – 1 базавая велічыня) пераможцаў:

- аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц;
- Лагішынскую гарпасялковую бібліятэку;
- Парахонскую сельскую бібліятэку.

3. Адзначыць Дыпломамі:

- Пінкавіцкую СБ (загадчык бібліятэкі Палюховіч І.А.) *за тэатралізаванае прадстаўленне “Жыве ў сэрцы памяць пра вайну”;*
- Азарыцкую СБ (бібліятэкар Чугай В.С.) *за тэатралізаванае прадстаўленне “Мы верили, мы знали – победим!”.*

4. Кантроль за выкананнем пастановы ўскласці на дырэктара дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” Анташук А.І.

Старшыня Савета,
начальнік аддзела ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама Л.В. Галавач